**ВЫВУЧЭННЕ ЧАСЦІН МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ**

***І.В. Самойленка*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – В.Я. Барысенка, канд. філал. наук, дацэнт

Навучанне мове як унармаванай сістэме і сродку, які забяспечвае працэс мыслення і камунікацыі, мае на ўвазе асэнсаванне фунцыянальна значымых, семантычна напоўненых моўных адзінак і іх кампанентаў. Важна дапамагчы вучням пачатковых класаў зразумець, як моўныя адзінкі функцыянуюць ў паведамленнях, як яны фарміруюцца, якую канструктыўна-граматычную і сэнсава-стылістычную ролю выконваюць у тэксце, як уключаюцца ў кантэкст звязнага маўлення. Такое вывучэнне марфалогіі адпавядае сучасным патрабаванням навучання і прынцыпу адзінства формы, значэння і функцыі моўных адзінак, і дапамагае вучням засвоіць часціны беларускай мовы.

Мову звычайна вызначаюць як сістэму сістэм, падкрэсліваючы яе складанасць, наяўнасць у ёй разнастайных элементаў, на якія яна як адзінае цэлае раскладаецца. Пры гэтым неабходна звярнуць увагу на тое, што мова, з аднаго боку, – гэта строга арганізаваная сістэма, пры раскладанні якой вывучаюцца яе элементы ў кантэксце больш буйных адзінак; з другога – мова ўяўляе сабой рухомую сістэму, якая адлюстроўвае зменлівую рэчаіснасць, а такая рэчаіснасць патрабуе адпаведных моўных формаў. Такі характар мовы прадугледжвае наяўнасць у ей адзінак, якія адрозніваюцца ступенню адцягненасці значэнняў.

Адбор і структураванне вучэбнага матэрыялу залежыць ад практычнага валодання малодшымі школьнікамі беларускай мовай і ўзроўню тэарэтычных уяўленняў аб сістэме мовы. Чым ніжэйшыя гэтыя ўзроўні, тым больш увагі надае настаўнік інтэграванню моўнага матэрыялу. Павышэнне ўзроўня моўнай адукацыі патрабуе большай дыферэнцыяцыі зместавых кампанентаў. Гэтая заканамернасць можа змяняцца на розных этапах моўнай адукацыі, але ў пачатковых класах яна адносна стабільная.

Суадноснасць інтэгравання і дыферэнцыяцыі моўнага матэрыялу мэтазгодна разглядаць на аснове структурна-кампазіцыйнага прынцыпу канцэнтрызму, сутнасць якога заключаецца ў паўторным вывучэнні матэрыялу, але з рознай ступенню інтэгравання і паглыблення. Напрыклад, у 2 класе агульнаадукацыйнай школы разглядаюцца словы, якія абазначаюць прадметы, дзеянні, прыкметы прадметаў; а ў наступных класах – гэта часціны мовы з уласцівымі ім лексіка-граматычнымі катэгорыямі.

Такім чынам, правільна і сістэматычна арганізаваная праца настаўніка дапапожа вучням пачатковых класаў свядома засвоіць часціны беларускай мовы.

МГПУ им. И.П.Шамякина